НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,
твой народ
дачакаецца
Залацістага,
яснага дня!
М. Багдановіч.*

**№ 6 (74), САКАВІК 2009 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org – сайт нашага рэгіёна**

## НАЙВЯЛІКШАЕ СВЯТА БЕЛАРУСАЎ

Кожны год 25 сакавіка беларусы адзначаюць дзень незалежнасці. У гэты дзень пасля двухсотгадовай расейскай акупацыі ў 1918 годзе ў Менску была абвешчана Незалежнасць Беларускае Народнае Рэспублікі ( БНР ). Для беларусаў гэта была найвялікшая падзея XX стагоддзя, бо ў стварэнні нацыянальнай дзяржавы сэнс гістарычнага існавання кожнага народа. Абвяшчэнне БНР сталася вынікам велізарных высілкаў, працы і ахвяраў беларускіх адраджэнцаў. Прыняццём АКТУ 25 САКАВІКА 1918 году быў завершаны доўгі гістарычны шлях нашага народа да адраджэння беларускай дзяржаўнасці і дэмакратычных свабодаў у Беларусі. Паўнамоцныя прадстаўнікі Ўсебеларускага кангрэсу ўзялі лёс Беларусі ў свае рукі. Было заяўлена, што ў межах рассялення і колькаснай перавагі яе насельніцтва Беларусь абвяшчаецца Народнай Рэспублікай – БНР. Дзяржава БНР была незалежнаю і вольнаю еўрапейскаю дзяржаваю. Утварэнне незалежнай беларускай дзяржавы выратавала беларусаў ад фізічнай смерці ў савецкай імперыі. Нягледзячы на тое, што наша незалежніцкая хада была перапыненая на 80 гадоў была перапыненая бальшавіцкім акупацыйным рэжымам, ідэалы БНР ніколі не паміралі. Бо няма нічога наймацнейшага перад воляй свабоднай нацыі. Гэта падцвердзілі беларусы, калі ў 1991 годзе аднавілі сваю дзяржаўную незалежнасць, вярнулі на дзяржаўны пасад нашыя святыя гістарычныя сімвалы – герб Пагоня і Бел-Чырвона-Белы сцяг. Але ў 1994 годзе маскоўскі рэйх з дапамогай заходніх крэдытаў ачухаўся пасля частковага распаду і банкруцтва і зноў пачаў свой захопніцкі паход на Усходнюю Еўропу. Расейскія спецслужбы з дапамогай ваенна-бюракратычнай савецкай наменклатуры здзейснілі дзяржаўны пераварот. Яны прывялі да ўлады свайго расейскага стаўленіка – Аляксандра Лукашэнку. Над нашай краінай зноў навісла смяротная небяспека расейскай акупацыі. За 15 гадоў прарасейскага рэжыму быў разбураны беларускі бізнэс, закрыты беларускія школы, знішчаецца беларуская культура, мова, фундаментальная навука. Дайшло да таго, што нават Акадэмія навук стала стратнай. Лепшыя прадстаўнікі беларускай нацыі выцеснены ў эміграцыю, у маргінальныя групы. З Беларусі выкачалі найбольш здольную працоўную сілу. Вынішчана гістарычная памяць беларускага народа аб незалежнай і вольнай Беларусі як еўрапейскай краіны. Краіну па сутнасці ператварылі ў адсталую расейскую правінцыю, у якой прамаскоўскі рэжым танным алкаголем спойвае працавітае карэннае насельніцтва, а з Расеі і яе сатэлітаў перасяляе адкіды грамадства: чыноўнікаў-казнакрадаў, ваенных пенсіянераў, дзялкоў крымінальнай эканомікі, маральна састарэлае і дэградаванае насельніцтва, бамжоў ды валацуг. Кожны адукаваны беларус павінен памятаць, што цяперашняя ўлада – небеларуская, яе палітыка таксама небеларуская. Гэта марыянетачная ўлада будзе па загаду Масквы прадаваць усё за капейкі ў чужую суседнюю дзяржаву. Больш таго, беларусам ужо навязалі доўг на 15 мільярдаў долараў. Так атрымалася, што лукашэнкавы чыноўнікі самі несвабодныя ( дарэчы як і сам Лукашэнка), яны былі, ёсць і будуць прыслужнікамі Расейскай Федэрацыі. Абсалютная большасць прадстаўнікаў улады Лукашэнкі не маюць нацыянальнасці, бо ў іх няма нацыянальнай свядомасці. Нацыянальнай ідэі для народа стварыць так і не здолелі, яны служаць не беларускаму народу, а інтарэсам Крамля. Яны не змогуць аб'яднаць беларускі народ, таму што каля чаркі ды шкваркі аб'яднаць можна толькі людзей, якія не маюць нічога, апроч жывёльных інстынктаў. Будзе як раз наадварот - кавалак каўбасы, кінуты людзям , якія больш дагадзілі начальству, яшчэ больш раз'яднае грамадства. Каб неяк схаваць здрадніцкія планы па канчатковай здачы Беларусі ў Расею, рэжым пайшоў на хітрыкі: палітрукі штучна стварылі міф аб "дне незалежнасці" 3 ліпеня. Па іх легендзе выходзіць, што беларусы чатыры гады стагналі пад нямецкай акупацыяй, а Савецкая Расія вызваліла іх ад прыгнёту. Але ж не беларусы развязалі вайну з Германіяй. Гэта не наша вайна, гэта вайна – чужынская, імперская і захопніцкая па сутнасці, як з боку гітлераўскай Германіі, так і сталінскай Расеі. Улазіць у чужыя разборкі ніхто не забараняе. Але ж і гнаць на бойню наш народ савецкім расейцам права ніхто не даваў. Гэты савецкі міф аб незалежнасці 3 ліпеня не мае пад сабой рэальнай гістарычнай перспектывы і навязаны беларусам гвалтоўна. Ён будзе забыты. Не стане рэжыму Лукашэнкі, праз пяць хвілін забудуць і яго самога, і яго калгасны сцяг з гярбом, і ўсю віртуальную "Советскую Белоруссию". Ды і кім быў бы ён сам, калі б не было свядомых адраджэнцаў, якіх ён загадвае лупіць міліцэйскімі дубінкамі. Жыў бы ў адной з шасці расейскіх губерній "Северо-западного края" і цягнуў сірочую лямку збяднелага калгасніка. Вось ужо і сапраўды: адзін садзіць яблыню, а другі зрывае яблыкі ды яшчэ сукі ламае. Аднак сам ход гісторыі сведчыць, што беларусы непазбежна вернуцца ў еўрапейскі дом не зважаючы ні якія перашкоды. Сапраўдная незалежнасць ідэі БНР будзе надзейным гарантам свабоды ад "вялікага старэйшага брата". Ніхто не будзе страшыць, што наш народ не зможа выжыць без апекі вялікай краіны, таму што не мае алмазаў, золота, нафты і газа. І тады кожны зразумее, чаму галандцы ці бельгійцы жывуць у дзесяткі разоў лепш за вялікіх расійцаў, пры гэтым не маючы ні газа, ні нафты, ні золата з алмазамі, ні нават старэйшага брата.

**Алесь Шумскі.**

## Уладу турбуе ўзровень жыцця людзей

**Я не запрещаю кризис, я требую, чтобы его не было.**
**А. Лукашенко.**

Урад Рэспублікі Беларусь стварыў неабходныя ўмовы для развіцця малых гарадоў. На думку прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, праграма развіцця рэгіёнаў развівалася ў цэлым паспяхова. Колькасць насельніцтва, занятага ў эканоміцы малых гарадоў, павялічылася ў параўнанні з папярэднім годам узрасла на сорак тысяч чалавек. Па выніках леташняга года намінальна налічаная сярэднемесячная зарплата склала 731, 2 тысячы рублёў. Рэальная зарплата павялічылася на 7,3 працэнты. А якія поспехі ў рабоце мясцовай улады па рэалізацыі дзяржаўнага праекта на Шуміліншчыне? Для таго, каб мясцовая ўлада працавала больш эфектыўна, у райвыканкаме створаны гэтак званыя інфармацыйна-прапагандысцкія групы. І спецыялістаў для работы з насельніцтвам на месцах дастаткова. А апошні раз дэлегацыя прапагандыстаў на чале са старшынёй райвыканкама В. А. Падлешчуком наведала калектыў работнікаў прадпрыемства меліярацыйных сістэм. У прыватнасці, пасяджэнне было прысвечана абмеркаванню дзяржаўнай палітыкі ў сферы рэгулявання і фарміравання даходаў насельніцтва. З асноўнымі крыніцамі даходаў насельніцтва раёна азнаёміла прысутных намеснік начальніка ўпраўлення па працы Н. М. Шышко. Паводле яе слоў, прыведзеныя лічбы былі ніжэйшыя за сярэднестатыстычныя па краіне. Напрыклад, сярэдняя зарплата на сённяшні дзень склала 632,2 тысячы рублёў, сярэдняя пенсія – 389 тысяч рублёў. Магчыма, што для нашага рэгіёна гэта і нядрэнна. Аднак гэтыя "сярэднія" паказчыкі не даюць поўнай карціны рэальнай сітуацыі. Калі даходы жыхароў раёна нібыта забяспечваюць іх стабільнае існаванне, чаму тады значна пагоршылася дэмаграфічная сітуацыя? Згодна з афіцыйнымі дадзенымі, за апошнія два месяцы нарадзілася 46 чалавек, а памерла – 77. Пры гэтым толькі кожны трэці сканаў ад старасці. Пераважная большасць насельнікаў раёна памірае ад хвароб сістэмы кровазвароту – 31 чалавек, атручэнні, суіцыды і траўмы сталі прычынай смерці 14-ці чалавек. Няўхільна расце алкагалізацыя насельніцтва. За тры месяцы бягучага года на душу насельніцтва прадалі па чатыры вядры віннага нопою ( 40,3 літры). На ўліку ў нарколага цяпер знаходзіцца 628 чалавек. Вялікую небяспеку выклікае такая сацыяльная хвароба, як туберкулёз. У раёне хварэе 71 чалавек, з іх тры памерлі ў мінулым годзе. Не абмінула наш раён і чума XX стагоддзя – СНІД. З чатырох ВІЧ-інфіцыраваных памерлі тры чалавекі. Не выклікае сумненняў, што найважнейшы скарб нашага краю – гэта людзі. Менавіта па іх узроўню жыцця трэба ацэньваць вынікі работы мясцовай улады. А вынікі, як бачым, не дацягнулі нават да сярэднестатыстычных паказчыкаў па краіне.

**А. Прылуцкі.**

## Адзіны дзень прафарыентацыі

Кожны год у раёные праходзяць гэтак званыя дні прафарыентацыі для выпускнікоў школ. Мэта гэтых мерапрыемстваў – дапамагчы выпускнікам вызначыцца ў прафесійным жыцці. А кіраўніцтва раёна ў сваю чаргу занепакоена дэфіцытам кадраў. Адчуваецца вострая няхватка спецыялістаў сельскай гаспадаркі, інжынерна-тэхнічных спецыялістаў і рабочых будаўнічых прафесій. Не затрымліваюцца ў раёне і медыкі – ужо не хапае больш за два дзесяткі ўрачоў. Па ініцыятыве раённага аддзела адукацыі ў актавай зале сабралі выпускнікоў 9-х і 11-х класаў з усіх школ раёна. А ў гэтым годзе кагорта выпускнікоў складае 251 адзінаццацікласнікаў і 560 выпускнікоў 9-х класаў. На злёце прысутнічалі госці з універсітэтаў, акадэмій і каледжаў Віцебскай вобласці. Выкладчыкі праінфармавалі будучых абітурыентаў аб тых спецыяльнасцях, якім можна навучыцца ва універсітэтах. Напрыканцы сходу выступіла старшыня райсавета І. М. Новікава, якая адзначыла, што ў раёне можна ўладкавацца па любой спецыяльнасці. Ад імя раённых уладаў Ірына Мікалаеўна абяцала стварыць годныя ўмовы для працы новых кадраў.

**Я. Вайтовіч.**

## НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ РОДНАГА САЙТА

На рэгіянальным сайце http://haradok.belarda.org , які змяшчае навіны усходняй Віцебшчыны, адбыліся змены. На сайце маецца "Карысная інфармацыя" ў якой у каталагу "Файлавы архіў" размешчаны PDF-версіі незалежных выданняў рэгіёна, у тым ліку і нашага выдання "Світанак". І вы маеце магчымасць чытаць электронную версію выдання раней, чым яна трапіць у вашу скрыню.

Адначасова з гэтым на сайце з'явілася магчымасць размяшчаць прыватныя абвесткі ў раздзеле "Апошнія аб'явы", а таксама карыстацца гэтымі аб'явамі.

Адміністратары сайта заклікаюць наведвальнікаў сайта выкарыстоўваць "Зваротную сувязь" і дасылаць свае навіны для размяшчэння на сайце. Найбольш актыўных наведвальнікаў сайта чакаюць прызы. Нагадваем таксама, што на сайце пастаянна вядзення апытанне наведвальнікаў.

**Вынікі апытання на http://haradok.belarda.org:**

**Навінам з якіх крыніц Вы больш давяраеце?**

| | |
|---|---|
| Дзяржаўнае радыё, ТВ | 4% |
| Дзяржаўныя газеты | 4% |
| Незалежныя выданні | 28% |
| Інтэрнэт-рэсурсы | 24% |
| "Радыё Свабода" | 40% |

## АБ'ЯВА

***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску.***

***Рэдакцыя "Світанак" змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанак».***

# ЧАМУ СХАВАЛІ БЕСПРАЦОЎЕ?

Класічны эканамічны крызіс– гэта падзенне вытворчасці, банкруцтва і закрыццё прадпрыемстваў, скарачэнне штатаў і рост беспрацоўя. Гэтыя паказчыкі цесна звязаны паміж сабой і па іх можна меркаваць, наколькі глыбокім з'яўляецца крызіс. Здавалася б, найбольш праблемаў з працаўладкаваннем павінна быць у малых гарадах і пасёлках, бо там, як правіла, не дужа развіта прамысловасць, а рабочых рук заўсёды багата. Аднак афіцыйныя даныя па ўсім рэгіёнам Беларусі сведчаць аб надзвычай аптымістычнай сітуацыі. Напрыклад, узровень беспрацоўя з 2,3 % у 2007 годзе знізіўся да 1,3 на 1 студзеня 2009 года. Тады колькасць беспрацоўных у малых гарадах знізілася ў 1,7 раза. Ці можна гаварыць у такой сітуацыі пра крызіс? А можа дзяржаўная статыстыка ў нечым разыходзіцца з рэальным становішчам і не адлюстроўвае рэчаіснасць? Цяжка паверыць у такое, што ў нашым раёне беспрацоўе складае ўсяго адзін працэнт. Шумілінцам убіваюць у галаву міф аб пагалоўнай занятасці ўсяго працаздольнага насельніцтва. А тыя 100 зарэгістраваных чалавек, якія звярнуліся ў цэнтр занятасці – гэта нібыта купка гора-няўдачнікаў, якія толькі псуюць ідылічную карцінку працоўнага свята. Але няблага было б даведацца ад рэальнай сітуацыі. Ёсць адзін бясспрэчны фактар, які ўплывае на такую недарэчную статыстыку. Справа ў тым, што дапамога па беспрацоўю ў сярэднім складае 40 тысяч рублёў на чалавека ў месяц. Да таго ж беспрацоўны павінен адпрацаваць за гэты час два дні ў калгасе або здаць некалькі кілаграмаў макулатуры. Менавіта па гэтай прычыне сотні людзей не становяцца на улік у цэнтр занятасці. Новошта марнаваць час на клёнчанне тых капеек, якія здзекліва называюць "выплатай дапамог па беспрацоўю". Калі б, напрыклад, дапамога была ў памеры 100 долараў, то працэнт беспрацоўных рэзка падскочыў бы.Найбольш актыўныя людзі маладога і сярэдняга ўзросту выязджаюць за межы раёна і краіны на заробкі. У мінулым годзе іх налічвалася каля двух з паловай тысяч. Выходзіць так, што тысячы працавітых людзей жывуць у раёне і не маюць афіцыйнага статусу. І гэту праблему абазвалі "схаваным" або "ценявым" беспрацоўем і на гэтым паставілі кропку. Аднак далёка не ўсе людзі без працы падводзяць сябе належным чынам. У барацьбе за выжыванне яны гатовыя на ўсё. Нямала ў раёне і такіх, якія жывуць за кошт родзічаў або вядуць антысацыяльны спосаб жыцця. Праглядаючы міліцэйскія сводкі, звяртаеш увагу на дзве катэгорыі беспрацоўных (яны часцей за іншых парушаюць закон). Адны абкрадаюць пенсіянераў, залазяць у крамы, п'юць гарэлку, скандаляць, многія з іх ужо былі асуджаны. Другія – проціглегласць ім. Яны самі сабе ствараюць "рабочыя месцы". Вось затрымалі машыну з кантрабандным таварам на некалькі мільёнаў, за рулём – беспрацоўны. І тэхнічным спіртам або каляровым металам гандлююць гэтаксама беспрацоўныя. Дык які статус гэтых людзей па сутнасці? Тым не менш, трэба адзначыць, што нашы людзі трымаюцца за працу да апошняга. Працы многа, зарплата нізкая, а яны не імкнуцца нешта змяніць у жыцці. Такой сітуацыі садзейнічае палітыка цяперашняй дзяржавы. Тут ёсць свой разлік. Чаму прадпрыемствы не звальняюць рабочых, хоць у гэтым і ёсць неабходнасць, а змяншаюць памеры зарплаты ўсяму калектыву ці пераходзяць на няпоўны працоўны тыдзень? Калі б была выбрана такая тактыка, то вялікая колькасць людзей апынулася б на мяжы выжывання. І больш за ўсіх пацярпела б улада Лукашэнкі. А так "рынкавы сацыялізм" дае ўсім заробкі меншыя ва ўсім калектыве, і гэта не так ужо і балюча. І потым, калі крызіс закончыцца, дзе тады прадпрыемству зноў набрацца спецыялістаў? Высокакваліфікаванымі кадрамі не раскідваюцца. З усяго відаць, што статыстыка павінна быць максімальна поўнай, і гэта датычыцца не толькі беспрацоўя, але і эканомікі ў цэлым. Як гэта бывае падчас з ростам вытворчасці. Урад выхваляецца ростам паказчыкаў вытворчасці, а склады завалены запасамі незапатрабаванай прадукцыі. Аб'ектыўная статыстыка патрэбная для таго, каб можна было своечасова зрабіць адпаведныя меры, адрэагаваць на негатыўныя тэндэнцыі. А інакш для чаго лічбы, якія ствараюць ілюзію дабрабыту? Каму патрэбна гэта фантастычная хлусня? Адказ вельмі просты: эканоміка тут не пры чым. Гэта добра прадуманая палітычная кампанія на ўзмацненне аўтарытэту самага разумнага, чэснага, дальнабачнага кіраўніка, які ніколі не памыляецца. Які дзень і ноч клапоціцца аб простым народзе. І кіраўнік гэты – Аляксандр Лукашэнка. Колькі б беспрацоўных не было – усё роўна будзе адзін працэнт. Колькі б галасоў на выбарах ён не набраў – усё роўна яму паставяць 90 працэнтаў.

**Аляксандр Шчамлёў.**

# Святкаванне прайшло з затрыманнем Аўтухова

**25 сакавіка грамадзяне ў Віцебску адзначылі Дзень Волі ўскладаннем кветак да мемарыяльных месц Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча.**

Пры знаходжанні ля помніка Васілю Быкаву з бел-чырвона-белым сцягам быў затрыманы Леанід Аўтухоў.

На 25 сакавіка ініцыятару сходу выбарчыкаў на плошчы Свабоды Кастусю Смолікаву (старшыні Віцебскай абласной арганізацыі Партыі БНФ) было адмоўлена ў праве правесці сход грамадзян з нагоды 91-гадавіны абвяшчэння БНР.

Аб гэтым Смолікаў паведаміў грамадзянам, якія прыйшлі каля 17 гадзін на плошчу Свабоды, адначасова з гэтым прысутным было прапанавана прайсці да памятных месц Віцебска – мемарыяльнай шыльды Васілю Быкаву і помніку Уладзіміру Караткевічу.

У скверы Маякоўскага ля шыльды Васілю Быкаву актывіст Руху за Свабоду, старшыня Гарадоцкай арганізацыі Партыі БНФ Леанід Аўтухоў падняў ўверх бел-чырвона-белы сцяг, пад якім быў пахаваны народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў. Спадар Смолікаў прапанаваў ускласці кветкі да шыльды Васілю Быкаву, што і было зроблена.

Дзве асобы ў штацкім хацелі зняць нацыянальны сцяг, але спадар Аўтухоў у гэтым ім адмовіў, тады на дапамогу штацкім прыйшлі людзі ў міліцэйскай форме, якія даставілі Леаніда Аўтухова ў Кастрычніцкі РАУС.

Грамадзяне Беларусі пасля дадзенага здарэння дайшлі да помніка Уладзіміру Караткевічу. Кастусь Смолікаў прапанаваў ускласці кветкі да помніка славутага беларуса – Уладзіміра Караткевіча. Пасля гэтага быў выкананы гімн БНР «Мы выйшлі шчыльнымі радамі».

Пры спробе запусціць у вечаровае неба балонікі ў бел-чырвона-белым сцягам, яны былі гвалтоўна вырваны з рук жанчыны асобай у штацкім. Асоба ў штацкім пракалола балонікі, выбухі якіх сталі салютам славутаму сыну Беларусі Уладзіміру Караткевічу.

Пасля грамадзяне звярнуліся ў Кастрычніцкі РАУС, каб даведацца аб лёсе Леаніда Аўтухова.

З паведамлення дзяжурнага РАУС Леанід Аўтухоў затрыманы да раніцы 26 сакавіка і яго ў 10 гадзін чакае суд Кастрычніцкага раёна г. Віцебска.

**Леанід Гаравы.**



# Магчыма нядрэнна зарабляць

Недахоп вартых рабочых месцаў для працаўладкавання па-ранейшаму застаецца даволі вострай праблемай для нашага раёна. Звычайна выбар вяскоўцаў абмежаваны тутэйшым калгасам ды некалькімі аб'ектамі сацыяльнай сферы. Таму вельмі важна ствараць новыя магчымасці для дадатковай занятасці. Аднак ужо сёння можна ўзгадаць прыклад таго, як прыватнікі паспяхова разгортваюцца ў глыбінцы. Год таму пачалася гісторыя прадпрыемства "Шумілінагандальбуд". Яго дырэктар У. В. Карнілаў пачынаў свой працоўны шлях усяго з пяці чалавек. Зараз фірма будаўніча-рамонтных работ налічвае 40 рабочых і спецыялістаў. На рахунку калектыву некалькі аб'ектаў: аграгарадок у Мішневічах і Амбросавічах, рамонт клуба ў Кардоне. Пакуль што хапае працы ў межах нашага раёна – заключаны дагаворы на шэраг падрадных работ. Многія рабочыя раёна хацелі ўладкавацца на працу ў будаўнічую фірму, каб нядрэнна зарабіць. За мінулы год на прадпрыемстве паспелі пабываць паўтары сотні чалавек, але большасць не вытрымалі ўмоваў працы на прадпрыемстве. "Шумілінагандальбуд" – не ляжачы калгас, дзе можна хадзіць на працу па прынцыпу: абы дзень залічылі. Тут трэба працаваць сумленна і прафесійна, таму аматары лёгкага хлеба хутка адсейваюцца. А будаўнікі фірмы Карнілава зарабляюць у месяц каля мільёна рублёў.

**А. Прылуцкі.**


## АБВЕСТКІ

*Прадам:*

**домік у Шуміліне. Тэл. 8(0212) 21-93-14.**

**Аднапакаёвую кватэру ў цэнтры Шуміліна. Тэл. 8(029) 710-91-16.**

**Сена. Тэл. 3-30-05.**

**Лазню. Тэл.3-84-79.**


# ПРЫНЦЫПОВЫ КІРАЎНІК

У адзін калгас з абласной базы быў адпраўлены трактар. Атрымалі яго, узрадаваліся, пачалі складаць акт прыёму і выявілі, што шкло правай фары з трэшчынай. А старшыня гэтага калгаса вельмі любіў караць вінаватых і загадаў скласці пратакол. Пратакол гэты ад яго імя адправілі на базу з просьбай даслаць новае шкло фары. Работнікі базы абурыліся. Даслалі факс, у якім паведамілі старшыні, што прэтэнзіі яго не прымаюць. Ва усім абвінавацілі чыгунку, з яе і трэба спаганяць. Старшыні не спадабаўся адказ базы і ён зноў вырашыў дабіцца справядлівасці. Выпісаў камандзіроўку калгаснаму юрысконсульту, выдаў грошы і паслаў яго ў дзяржаўны арбітраж судзіцца з базай. Той справу прайграў, ды яшчэ прывёз у калгас патрабаванне аб выплаце судовых выдаткаў. Кіраўніцтва чыгункі пералажыла ўсю адказнасць за трактар на завод. Старшыня асабіста пазваніў дырэктару завода. Той уважліва выслухаў, крыху падумаў, а затым... паслаў старшыню туды, куды не ганялі калгасных цялят. Але, як кажуць, не на таго напалі. Старшыня калгаса вырашыў ісці да канца. Прагнаў нягеглага юрысконсульта, наняў за вялікія грошы вопытнага юрыста з камерцыйных структур і паслаў яго судзіцца з заводам. Справа ў арбітражу цягнулася некалькі месяцаў і ў рэшце рэшт вырашылася на карысць калгаса. Юрыст сам прывёз з завода новенькае шкло, якое ўрачыста было ўстаўлена ў фару. Трактарыст у гонар перамогі старшыні над бюракратамі даў доўгі сігнал. Цяпер аўтарытэт старшыні падняўся ў вачах калгаснікаў яшчэ больш. Яны так і не зразумелі, колькі гэты прынцыповы кіраўнік і змагар за інтарэсы народа выструсіў грошай з іхных кішэняў за новую запчастку. Дзіва, што шкло фары не абы-якое, а залатое. Цана яго раўняецца кошту камандзіровак юрыстаў, судовым выдаткам і сапсаваным нервам "бюракратаў".

**М. Корбан.**

# Урачыстая цырымонія

Райвыканкамаўскія служачыя правялі ў памяшканні ГДК мерапрыемства, прысвечанае Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. На гэты раз запрасілі шмат гасцей: ветэранаў працы і вайны, чыноўнікаў, прадстаўнікоў прадпрыемстваў, школьнікаў старэйшых класаў. Урачыстую цырымонію адкрыла старшыня раённага Савета дэпутатаў. І. М. Новікава. Ірына Мікалаеўна напомніла прысутным пра указ кіраўніка краіны А. Г.Лукашэнкі, у якім 2009 год абвешчаны Годам роднай зямлі. А навядзенне парадку пачынаецца з прыёму ў шэрагі грамадзян новых маладых людзей. Старшыня райсавета падцвердзіла, што пашпарт грамадзяніна РБ – самы галоўны дакумент. Новыя пашпарты былі ўручаны 38 маладзёнам нашага раёна. Маладыя грамадзяне шумілінскага краю перад інспектарам РАУС па грамадзянству А. Пракоф'евай, начальнікам па справах моладзі М. Ганчаровай і старшынёй райсавета І. Новікавай прынялі сімвалічную прысягу. Старшакласнікі пакляліся быць не толькі сумленнымі і працавітымі, але яшчэ да гэтага прыкласці ўсе сілы для працвітання Радзімы. А каб новаспечаныя грамадзяне адчулі сябе ў дадатак і патрыётамі Рэспублікі Беларусь сакратар райкама ГА БРСМ А. Федчанка ўручыла 30 старшакласнікам членскія білеты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. На заканчэнне ўрачыстага мерапрыемства самадзейныя шумілінскія артысты с ГДК далі невялікі канцэрт, дзе ў песнях і вершах славілі родны край. Канешне, маладым людзям цяжка разабрацца, дзе сапраўдныя беларускія сімвалы, а дзе падмена паняццяў. На жаль, чноўнікі не расказалі дзецям, адкуль з'явіўся гэты новы для іх пашпартны дакумент з перааробленай БССРаўскай сімволікай. Няхай бы лепш растлумачылі, як яны здымалі ў 1991 годзе з будынку райвыканкама герб СССР, а затым устанавілі нацыянальную сімволіку – герб Пагоню. У 1994 годзе зноў знялі нацыянальны беларускі герб, а павесілі лукашэнкаўскі. І наогул, колькі яшчэ часу будзе калаціць савецкіх служак гэта "гербавая" ліхаманка?

**У. Арэшкін.**

# БНР. Значэнне і веліч 25 Сакавіка

Для хвалі беларускай эміграцыі, да якой я належу, дзень 25 Сакавіка быў заўсёды найвалікшым беларускім сьвятам, якое абавязкова адзначалася ўва ўсіх беларускіх асяродках у сьвеце. Гаворачы нядаўна пра сьвяткаваньне 25 Сакавіка з маімі аттаўскімі сябрамі, якія шмат пазьней выехалі зь Беларусі, я здала сабе справу, што пра значэньне Дня Волі – як мы цяпер называем гэтае сьвята – людзі ў Беларусі дасюль мала ведаюць. Да 80-х гадоў Масква старалася сьцерці яго з памяці нашага народу, а цяпер мы звычайна болей гаворым у гэты Дзень пра будучыню, чым пра мінулае. Будучыні я прысьвяціла мой Сакавіковы Зварот і ў гэтым годзе. Аднак канчаю яго словамі: "Ведама, што зарука будучыні – ў памятаньні мінуўшчыны".

Каб разумець веліч і значэньне акту 25 Сакавіка, мы мусім памятаць, як мы страцілі нашую дзяржаву, якой страшнай была няволя і якім доўгім было змаганьне найлепшых сыноў і дачок Беларусі, каб вярнуць свайму народу яго права "людзьмі звацца". Акт 25 Сакавіка быў іх перамогай над цемрай, над зьдзекам, над імперскімі намерамі суседняй дзяржавы сьцерці беларускі народ з паверхні гэтае Зямлі.

Паўтару яшчэ раз: каб ня было 25 Сакавіка, каб ня было БНР, ня было б і БССР і ня было б



другога абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі ў 1991 годзе.

Ідэалы БНР – гэта перадусім незалежнасьць нашага краю. "Скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай", - гаворыцца ў Трэцяй Устаўной Грамаце БНР.

Рада БНР змагалася і бараніла незалежнасьць Беларусі праз доўгія гады "зьняменьня" нашага народу падчас Савецкага панаваньня. І абарона незалежнасьці зьяўляецца і цяпер галоўнай мэтай Рады БНР.

Ідэалы Рады БНР гэта і ёсьць адвечныя каштоўнасьці кожнага вольнага народу: дэмакратыя, УСЕ людзкія правы, у тым ліку і права на годнае і справядлівае жыцьцё, на працу, на дабрабыт. Адсутнасьць усялякае дыскрымінацыі, мажлівасьць карыстацца сваёй мовай, вучыцца на сваёй мове, берагчы сваю культуру і ганарыцца ёй.

Калі б мы маглі ажыцьцявіць гэтыя ідэалы, нашая моладзь не марыла б пра лепшае жыцьцё на чужыне, наш разумны народ прысьвячаў бы ўсе свае здольнасьці і намаганьні, каб заняць пачэснае месца між іншымі цывілізаванымі народамі сьвету.

Як ажыцьцявіць іх? Гэта мы зробім без асаблівых цяжкасьцяў, калі зразумеем, што кожны беларус ёсьць часткай нашага цела і нашай крыві, што мы ўсе браты і сёстры тае самае вялікае беларускае сям'і, сыны і дочкі тае самае беларускае зямлі. Калі слова салідарнасьць увойдзе ў нашую мову і ў нашыя звычаі, так як яно ўвайшло ў мову і звычаі нашых суседзяў. Калі давер адзін да аднаго будзе часткай нашага жыцьця і калі мы зразумеем, што без бясконцай любові да Бацькаўшчыны мы назаўсёды застанемся няпоўнавартаснымі, другараднымі грамадзянамі чужых краінаў.

Ажыцьцяўляць гэтыя ідэалы мы можам толькі знутры. Ніхто за нас гэтага ня зробіць. Але затое ўвесь цывілізаваны сьвет адкрые нам свае дзьверы, калі мы гэта зробім. Увесь сьвет будзе бараніць нашыя правы, і ў выпадку патрэбы – нашую волю і нашую незалежнасьць.

У сучаснай Беларусі патрэбныя зьмены. Народ наш мусіць пахазаць, што ён гэтага жадае, Так, як гэта паказалі нашыя суседзі, якія цяпер занялі ў сям'і народаў тыя пачэсныя месцы, якія маглі б займаць і мы. Цяперашнія ўлады паказалі, што дабро беларускага народу ня ёсьць іхнім прыярытэтам і што іх інтарэсы не супадаюць з інтарэсамі беларускага народу. Дык, магчыма, час падумаць пра развод?

**Івонка Сурвіла.**

# ВОСТОЧНОЕ ПАРТНЕРСТВО– ШАНС ДЛЯ СТРАНЫ

***Лидер общественной организации «Движение «За свободу» Александр Милинкевич рассматривает участие Беларуси в программе Восточное партнерство как перспективный шанс для страны.***

«Восточное партнерство — это новый шанс для Беларуси. Я рад, что Европа сделала этот шаг», — заявил Александр Милинкевич на пресс-конференции в Минске.

Вместе с тем он считает, что «если Беларусь примет решение о признании Абхазии и Южной Осетии, то этим самым может привести к развалу Восточного партнерства». По мнению А.Милинкевича, позиция Беларуси по Абхазии и Южной Осетии, «даст или не даст шанс на евроинтеграцию страны». При этом он отметил, что «Россия для Беларуси должна быть стратегическим партнером, но Беларусь должна быть независимой в своем решении идти или нет в Европу».

А.Милинкевич также подчеркнул, что не является сторонником принципа «чем хуже для страны, тем лучше». «Нельзя радоваться тому, что придет большой кризис и все обвалится — это аморально», — подчеркнул он, добавив при этом, что «мировой кризис не сделает демократию в стране». По его мнению, «дестабилизация уменьшит белорусские шансы на независимость».

Отвечая на вопрос о так называемых политзаключенных, председатель общественной организации ответил, что «я стою на той позиции, что политзаключенным человека можно называть тогда, когда пройдет суд, когда правозащитники и международные организации скажут, что это политзаключенный».

Касаясь участия Беларуси в других программах кроме Восточного партнерства, А.Милинкевич выразил недоумение, что страна не участвует в программе «Добрососедство». «Там большая финансовая поддержка», — подчеркнул он.

Отвечая на вопросы журналистов, А.Милинкевич также сообщил, что не собирается сбривать бороду, которую носит более 30 лет. «Когда я шел единым кандидатом от оппозиции (на выборах президента Беларуси — ИФ), мне говорили, что нужно поменять имидж. Белорусы не воспримут дядьку с бородой», — рассказал он, добавив, что «я тогда не согласился ее сбрить, а уж теперь и подавно». «Я ношу бороду больше 30 лет, и я нравлюсь с бородой моим сторонникам и особенно женщинам», считает А.Милинкевич.

Александр Милинкевич, считает, что белорусская оппозиция не участвует в переговорах официального Минска и представителей европейских структур изза своей маргинальности.

«Было много разговоров почему белорусская оппозиция не принимает участия в переговорах белорусских властей и Запада. Она не заслужила этого, потому что стала маргинальной, слабой», — заявил Милинкевич.

«Мы (оппозиция — ИФ) меньше стали влиять на общество. Нам (оппозиции — ИФ) нужно решать вопрос не с Евросоюзом, что нас куда-то не позвали и не посадили за какой-то стол, а нужно решать вопрос о своем влиянии на белорусское общество», — считает А.Милинкевич.

Он также признал, что произошел определенный спад поддержки обществом оппозиции. «Мы зовем, в том числе и на уличные акции, но люди не идут», — сказал он.

В свою очередь заместитель председателя общественной организации «Движение «За свободу» Виктор Корниенко отметил, что «ситуация в настоящее время такова, что белорусская оппозиция не имеет и, скорее всего, не будет иметь монополии на отношения с Западом». «Но нам нужно сделать все, чтобы решить существующую проблему и стать участниками диалога», — подчеркнул он.

# СЭАНС МАГІІ НА "ВІЦЕБСКДРЭВЕ"

**Ушчываваньняў Аляксандра Лукашэнкі, якія ён абрынуў на апазыцыю пры наведваньні «Віцебскдрэву», загадкавай выглядае перш за ўсё іх несувымернасьць.**

Бывалі часы, калі апазыцыя ўсур'ёз пагражала ўладзе Лукашэнкі ці прынамсі кідала ёй моцныя выклікі: галадоўка дэпутатаў у 1995 годзе, каскад сапраўды масавых акцыяў увесну 1996 году, пагроза імпічмэнту ўвосень 1996 году, грамадзянскі чын Плошчы тры гады таму.

Але ніколі тады з вуснаў кіраўніка дзяржавы ня ліўся такі канцэнтраваны паток брудной лаянкі: «...у іх ці то па п'яні, ці ад нейкай дурноты ўсё гэта палезла праз вушы, празь іншыя месцы, праз усе дзіркі», «ажно верашчаць у адкрытую, што трэба патрабаваць ад уладаў», «вось гэта пазыцыя нашай вашывай апазыцыі. Ніякая яна не апазыцыя, гэта пятая калёна. Гэта ворагі беларускага народу».

А зь якой нагоды ўсё гэта гаварылася? З нагоды дыпляматычнага посьпеху афіцыйнага Менску, з нагоды таго, што эўрапейскія палітыкі, ветліва выслухаўшы аргумэнты Аляксандра Казуліна і Анатоля Лябедзькі, зрабілі насуперак іх рэкамэндацыям і парадам – 16 сакавіка міністры замежных справаў краінаў ЭЗ яшчэ на 9 месяцаў прыпынілі візавыя санкцыі адносна кіраўніка Беларусі і яшчэ 35 вышэйшых беларускіх урадоўцаў. На нешта большае Лукашэнку спадзявацца проста не выпадала.

Зь іншага боку сёньняшняя Беларусь – зусім ня сёньняшні Мадагаскар, масавых забурэньняў не назіраецца, войска на бок апазыцыі не пераходзіць, прэзыдэнцкі палац не захопліваe.

Дык з чаго ж гэткая дзікая вэрбальная агрэсія?

Магчымыя розныя тлумачэньні, у тым ліку і псыхіятрычныя. «І яны хочуць у гэтай краіне прыйсьці да ўлады? Відаць, ужо ня хочуць і не разьлічваюць, а проста зарабляюць грошы на чым папала», і праз слова - «яны гатовыя прадацца любому, каб толькі скруціць галаву Лукашэнку, ускочыць у крэсла самім і разбамбіць краіну».

Дык калі маюць намер «ускочыць у крэсла» прэзыдэнта, то, відаць, прыйсьці да ўлады ўсё ж хочуць. Ці ня хочуць? Глыбокая дыялектыка.

Але калі размова ідзе пра палітыка, які трымаецца ва ўладзе ўжо 15-ты год, псыхіятрычныя тлумачэньні лепш адкінуць. І прыгадаць пра яшчэ аднаго, насамрэч сур'ёзнага і небясьпечнага ворага беларускай улады – пра крызіс. Зьнешняя запазычанасьць працягвае расьці, экспарт разам зь беларускім рублём і занятасьцю падае, цэны адпаведна растуць.

Ранейшая мантра «у нас крызісу няма» ужо не працуе, яе магія блякне з кожным днём. І таму з кішэні дастаецца іншая, таксама магічная практыка – мантра пра злога чараўніка, які навёў сурокі. І ў межах гэтай практыкі рэальны ўплыў апазыцыі, рэальная пагроза, якая зыходзіць ад яе для ўлады, ня мае ніякага значэньня. Паехалі ў трыдзявятае царства брусэльскае, нашапталі слова чорнае, страшнае – вось ад таго і бядуе беларус. Гэта казка, вараж-ба. Якой лёгкі можна патрабаваць ад шаманскіх заклінаньняў? А выснова зразумелая – трэба да апошняга трымацца за добрага чараўніка, які адзін можа змагацца з чорнай магіяй злых чараўнікоў.

Не спрацуе? Хто ведае. Калі на грамадзтва насоўваецца нейкая бяда, прычыны якой ніхто, па сутнасьці, не разумее, калі людзі ў роспачы, калі іх сьвет, што здаваўся ўчора такім устойлівым, раптоўна абрынаецца, у сьвядомасьці падымаюцца на паверхню старажытныя, першабытныя пласты. Ratio зьнікае, у свае правы ўступае жахлівая казка. І Лукашэнка гатовы яе распавесьці.

Не, ёсьць і іншае, менш экзатычнае тлумачэньне: мэта – дабіць апазыцыю, якая атрымала чарговую палітычную паразу. А дзеля чаго? Каб паўтарыць трук, разыграны на мінулым тыдні зь візытам эўракамісара Фэрэры-Вальднэр, каб яшчэ раз прынізіць эўрапейцаў і паказаць ім, што ім зь іх уласных абставінаў давядзецца палюбіць Лукашэнку ня проста «чорненькім», а «вельмі чорненькім»? Дык можна ж і дадэманстраваць, Беларусь – не Азэрбайджан і не Туркмэністан зь іх нафтай і газам. Ці тут перасьцярога, што народ калі ня зараз, то праз пэўны час, усё ж ня вытрымае і выйдзе на вуліцы пад сьцягамі апазыцыі? А яна вялікая – менавіта такая пагроза? І аб'ектыўна, і з пункту гледжаньня Лукашэнкі.

Але такое тлумачэньне мае права на існаваньне. Больш таго – тут той выпадак, калі справядлівасьць гіпотэзаў можна будзе праверыць. Калі выступ на «Віцебскдрэве» стане сыгналам да новай маштабнай хвалі рэпрэсіяў, адпаведнай ужываньню тэрміналёгіі часоў сталінскага тэрору – тады справядліва тлумачэньне, паводле якога мэта – дабіць апазыцыю.

Калі ж не, калі і пасьля віцебскіх шчываваньняў рэпрэсіі будуць ісьці ранейшым роўным фонам, то гэта пацьвердзіць, што на «Віцебскдрэве» адбыўся сэанс палітычнай магіі і што ўладу палохае пэрспэктыва выхаду народу на вуліцу не пад сьцягамі апазыцыі, а пад зусім іншымі сьцягамі ці – што асабліва небясьпечна – зусім безь сьцягоў. І каб гэта прадухіліць і была расказаная казка пра злых чараўнікоў.



# ПУСТЫЕ ОБЕЩАНИЯ

## Предвыборные программы кандидата в президента А.Г. Лукашенко очень похожи, а кое-какими местами нагло списаны друг у друга.

**Виктор Малишевский,**
**malishevsky.livejournal.com**

Перебирал архивы и, совсем случайно, наткнулся на нечто. Три газеты «Советская Белоруссия» за 1994, 2001 и 2006 год. Там — три предвыборные программы кандидата в президента А.Г. Лукашенко. А там вот такое…

Ну, например, в 1994 и 2006 годах это «предвыборные программы кандидата в президента А.Г. Лукашенко», а в 2001 году сразу напечатана «предвыборная программа президента Беларуси А.Г. Лукашенко». Ну, а чево народ-та обманывать? Вот и Центризбирком не против.

А еще эти три программы одна на одну очень похожи, а кое-какими местами нагло списаны друг у друга. И там много хороших дано обещаний. И обещаний не давать пустых обещаний.

А некоторые наши достижения, правда, впечатляют: «свыше 1 миллиона человек ПОЛУЧИЛИ ЖИЛЬЁ — подавляющая часть из них — молодежь» (2001 год). Дык, я сравнил для вас эти три программы, и хоть до выборов далеко, прикинул уже сегодня идеальную предвыборную программу кандидата в президенты А.Г.Лукашенко в 2011 году.

***О коррупции***

**1994 год. «Отвести народ от пропасти».** Законы бессильны перед властью, которая их не выполняет. Преступность и коррупция порождается самим государством, которое не способно отвечать за состояние дел. Коррупция — это тормоз на пути становления правового социального демократического государства…. Органы власти, суды будут очищены от лиц, причастных к сделкам, дискредитирующих власть в глазах народа. Будут приняты



меры усиления ответственности чиновников. Декларация о доходах руководителей получат статус чрезвычайного документа.

**2001 год «Вместе за сильную и процветающую Беларусь».** Беспощадная борьба с коррупцией, чванством, хамством, кумовством и «семейными» кланами будет усилена. Криминал никогда не прорвется во власть! «Сломать» государство, ограбить народ не получится!

2006 год «Государство для народа» Мы не отступаем от политики решительной борьбы с коррупцией — этой ржавчиной, способной разъесть любое государство.

***О предпринимателях и частной инициативе***

**1994 года. «Отвести народ от пропасти».** Президент будет оказывать поддержку неспекулятивному предпринимательству и освободит его представителей от государственного рэкета. Будет прекращена практика создания криминогенных законов, вынуждающих честных людей становиться преступниками.

**2001 год «Вместе за сильную и процветающую Беларусь».** Будет упрощен процесс регистрации предпринимателей. Контроль производственных предприятий и фирм будет осуществляться 1 раз в год, других предприятий — 2 раза в год. Будет поощряться малый и средний бизнес — источник новых рабочих мест.

**2006 год «Государство для народа».** Будут выработаны стабильные и долгосрочные правила предпринимательской деятельности. Введем уведомительный принцип регистрации предпринимателей.

Наша налоговая система должна быть простой удобной прозрачной. Мы выступаем за партнерские отношения государства и бизнеса.

***О правах человека***

**1994 год «Отвести народ от пропасти».** Коррупция — это тормоз на пути становления правового социального демократического государства.

**2001 год «Вместе за сильную и процветающую Беларусь».** В стране будет создан институт уполномоченного по правам человека. Но президент не может переложить свою конституциональную обязанность быть гарантом прав человека на какой бы то ни было институт. Только глава государства сможет дать гарантию прав и свобод граждан…. Каждый человек имеет право на собственное мнение, он также будет иметь право свободно и без ограничений его высказать.

**2006 год «Государство для народа».** Ничего об этом в предвыборной программе нет

***О зарплате и ценах***

**1994 год «Отвести народ от пропасти».** Установление государственного контроля за ценообразованием, чтобы исключить рост прибыли за счёт повышения цен. Будет значительно повышена самостоятельность Нацбанка с целью устранения практики выпуска в обращение бестоварных денег.

**2001 год «Вместе за сильную и процветающую Беларусь».** В предстоящей пятилетке зарплата достигнет 250 долларов в среднем по стране. При этом сохранятся социальные гарантии, не допустим обвала цен. Учитель, врач, ученый будут получать зарплату в 1,2-1,5 раза выше средней.

**2006 год «Государство для народа».** Основная задача на ближайшие пять лет — довести качество жизни наших граждан до уровня, сравнимого с западноевропейским. Мы должны за пятилетие получить рост зарплаты, пенсий, стипендий — не менее чем вдвое. Снизить инфляцию до уровня не более чем 5% в год.

***Заключение***

**2001 год «Вместе за сильную и процветающую Беларусь».** Дорогие соотечественники! Я несу перед собой на своих мужских руках это еще неокрепшее создание — нашу Беларусь, как нежную и хрупкую девчушку — нашу синеокую Беларусь. За мои поступки ВАМ НИКОГДА НЕ БЫЛО И НЕ БУДЕТ СТЫДНО…. Ваш. Александр Лукашенко.

**2006 год «Государство для народа».** Дорогие друзья! Сегодня страна находится на подъёме. И первоочередная задача заключается в том, чтобы продолжить уверенное восхождение, не скатиться в пропасть экономических и социально-политических потрясений…Я предлагаю вам своё служение. Вам решать. Александр Лукашенко.

**2011 год. «Отвести народ от пропасти».** Дорогие друзья, соотечественники, народ Беларуси! Мы стоим над пропастью кризиса. Мы уже проходили такое. Инфляция в начале 90-х составила 3000%. Как и сейчас, тогда общий спад производства. Но нам удалось всё преодолеть и в какой-то момент даже достичь подъема. Я и сейчас не обещаю вам молочных рек и кисельных берегов. Не хочу лгать. Нам всем придется расплачиваться за то, что мы так долго терпели несостоятельную политику мировых держав.

Беспощадная борьба с коррупцией — этой ржавчиной, способной разъесть любое государство — еще больше будет усилена. Это тормоз на пути становления европейского государства, к которому мы стремимся по уровню жизни. Зарплаты повысятся в несколько раз и достигнут 250 долларов. Пенсии выйдут на уровень 2008 года.

Каждый человек будет иметь право свободно и без ограничений высказать своё мнение о мировом кризисе. Государство гарантирует вам в этом полную свободу слова. В стране будут приняты самые жесткие меры усиления ответственности чиновников перед чиновниками. Жильё должно быть еще более доступным, а права человека — правее и человечнее. Государство обеспечит свободное ценообразование, при этом жестко ограничит беспредел в ценах.

Вам опять не будет за меня стыдно. Мы сможем отвести страну на шаг от пропасти для разгона и начать всё сначала…

# «КАК ЗАЛАТАТЬ ДЫРУ В 4 ТРИЛЛИОНА?»

Одна из самых актуальных в последнее время тем как для финансистов, так и для любого гражданина нашей страны - «что порежут в бюджете и соответственно в моем кармане» - обретает некую определенность.

По информации «Е», правительством и Минфином подготовлено предварительное видение того, как и на чем страна будет экономить в рамках бездефицитного бюджета, требуемого Александром Лукашенко, от которого, в свою очередь, того же требует выделяющий нам деньги Международный валютный фонд. Это видение до конца текущего месяца должно быть направлено на утверждение главе государства.

По информации «Е», предложение по уточнению бюджета исходит из прогноза, что в текущем году он не досчитается около 8,5 трлн рублей запланированных ранее доходов. Если этих доходов не наблюдается в ближайшем будущем, следовательно, нужно сокращать расходы.

Самым простым вариантом было бы прекращение финансирования по всем государственным программам. Так совпадает, что объем их финансирования в «старом» бюджете на 2009 год составляет как раз искомые 8,5 трлн рублей. Но по такому простому пути, конечно же, никто никогда бы не пошел. Как же тогда президентские «Дети Беларуси», село и агрогородки, малые города и инновации?.. К тому же до того, как по внушению МВФ в самый последний день прошлого года было принято решение сделать бюджет бездефицитным, в нем уже планировалось превышение расходов над доходами.

Поэтому, чтобы добиться «нулевого варианта», сейчас приходится сокращать расходы на гораздо большую сумму, чем вышеуказанные 8,5 трлн рублей. Предварительно, по оценкам правительственных экспертов, для этого придется резать расходы на сумму около 11,3 трлн рублей.

Что же будут резать?

Во-первых, будет ограничен рост зарплат в бюджетном секторе. Это – категорическое требование МВФ в перечне условий по выделению Беларуси стабилизационного кредита в 2,4 млрд долларов. В ноябре под переговоры об этом кредите была уменьшена зарплата сначала госслужащим и военным, а потом и всем бюджетникам. Лучшее, на что могут теперь рассчитывать врачи и учителя, - это на повышение зарплат на 5% в мае, и то, если на это даст добро МВФ. На эти же самые 5% - и не более того - в течение года могут вырасти зарплаты на государственных предприятиях, а также предприятиях, где государство владеет блокирующим пакетом. Учитывая, что на таких объектах сегодня трудится до 80% всех работающих в стране, сокращение расходов довольно существенное.

По информации «Е» из своих источников, в рамках этой тенденции на последнем заседании Высшего государственного совета был поставлен вопрос о сокращении зарплат Павлу Бородину и свыше 100 его подчиненным. Оказывается, П. Бородин на своем посту получает в несколько раз больше, чем Александр Лукашенко. К сожалению, что из этого вышло, нам неизвестно.

Во-вторых, планируется на 50% урезать капитальные расходы министерств, концернов, заводов, институтов и прочих госорганизаций. Все они теперь должны загнать глубоко в себя желание купить новую мебель, компьютерную технику, другие товары длительного пользования.

Будет откорректирована и государственная инвестиционная программа - финансироваться будут в эти тяжелые времена только те объекты, которые сдаются в 2009 году. По подсчетам, это позволит сэкономить 30% средств от намеченного на текущий год объема капиталовложений.

В-третьих, предполагается серьезно сократить текущие расходы бюджетных структур, начиная от оплаты чиновникам и директорам транспорта и мобильной связи и заканчивая экономией электричества, воды и проведения евроремонтов.

Наконец, в-четвертых, где-то около 1,9 трлн рублей планируется освободить в результате закрытия или ограничения финансирования ряда государственных программ. Наибольшую экономию могут дать производственные программы (1,4 трлн рублей), расходы на социальные программы в текущем году уменьшатся на 0,3 трлн, на специальные – на 0,1 трлн рублей.

По нашей информации, на данный момент предлагается полностью заморозить в 2009 году финансирование программ по развитию пассажирских перевозок автомобильным транспортом, а также международных перевозок пассажиров и грузов. Нет сейчас денег на программу развития города Полоцка, на создание системы особо охраняемых природных территорий, на гидрометеорологическую службу и даже на программу «Качество».

По социальным программам будет «оптимизирована» система закупок медицинского оборудования и лекарственных средств. Экономить нужно будет также на компьютерах, наглядной агитации, оборудовании для учебного процесса.

Серьезно подрежутся расходы из государственных целевых фондов – траты дорожного фонда планируется уменьшить почти на 350 млрд рублей, ограничив в том числе финансирование развития инфраструктуры агрогородков. Расходную часть фонда охраны природы предлагается уменьшить на 150 млрд рублей.

Подводя черту, очень хочется верить в прозорливость наших чиновников, в то, что прогнозируемый объем падения доходов бюджета составит не более 8,5 трлн рублей. Глядя на предварительные оценки по марту, включая очередное сокращение темпов роста ВВП до 1,5%, пока верится больше в то, что дополнительных резекций расходов не избежать…

**Вадим Сехович,**
**«Ежедневник».**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна